тезисы докладов о финансовом положении БССР, доклад управления коммунального хозяйства НКВД БССР «Дорожное строительство Белоруссии и задачи райисполкомов». 21 марта — 31 декабря 1924 г. 289 арк. // НАРБ. — Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 1500.

5. Довнар-Запольский, М. В. Исследования и статьи [Электронный ресурс] / М. В. Довнар-Запольский. — Киев: Тип. 1-й Киев. артели печ. дела, 1909. — Т. 1: Этнография и социология, обычное право, статистика, белорусская письменность. — Режим доступа: http://by.ethnology.ru/by_lib/dov-zap_01/graf/dov-zap_01_cont.html. — Дата доступа: 17.01.2016.

6. Чаянов, А. В. К вопросу теории некапиталистических систем хозяйства / А. В. Чаянов // Экономическое наследие А. В. Чаянова: труды / А. В. Чаянов. — М., 2006. — С. 59—106.

7. Документы о состоянии сельского хозяйства и очередных задачах аграрной политики в БССР (доклады, тезисы докладов, сведения, выводы и др.). 18 февраля — 31 июля 1925 г. 375 арк. // НАРБ. — Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 2295.

8. Стенограмма XIV съезда КП(б)Б от 26 [27] января 1932 г. 286 арк. // НАРБ. — Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 5590.

9. Бланки, отчеты, сведения. 1 января 1925—31 декабря 1925. 397 арк. // НАРБ. — Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 2292.

10. Стенограмма X съезда КП(б)Б от 3—10 января 1927 г. 708 арк. // НАРБ. — Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 3083.

11. Смоліч, А. Сельскагаспадарчыя раёны Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ў 1927—1928 гадах: папярэд. схема і мэтадал. увагі / А. Смоліч. — Мінск: [б. в.], 1930. — 138 с.

**Яноўскі Алег Антонавіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*

## РЭВАЛЮЦЫІ 1917 ГОДУ Ў ЛЁСАХ ПЕРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ БЕЛАРУСІ

Безумоўна, падзеі 1917 г. аказалі вызначальны ўплыў не толькі на змену палітычнага развіцця Беларусі, але і на лёсы тых, хто на пачатку 1921 г. так ці інакш стане прыхіляцца да ўдзелу ў стварэнні першага беларускага ўніверсітэта. Калі нейкім чынам з гэтага падыходу абагульняць той час, то натуральна казаць аб сумяшчэнні і ўзаемадапаўняльнасці вялікіх і малых катэгорый гістарычнага руху: сам універсітэт стаў рэальнасцю з-за рэвалюцыйнагаператрусу, а яго стваральнікі далучыліся да рэалізацыі даўно наспеўшай ідэі менавіта таму, што абедзьве рэвалюцыі 1917 г. літаральна выкінулі інтэлектуалаў са звыклых месц працы і побыту. Таксама, як і тыя палітыкі, што прынялі рашэнне аб пачатку дзейнасці ўніверсітэта ў Мінску: яны былі высунуты на першасныя ролі ў заблытанай і дастаткова выпадковай па сваіх наступствах ваенна-палітычнай і грамадскай сітуацыі 1917—1920-х гадоў.

З пазіцый гэтага спрошчанага і вельмі агульнага падыходу існуе магчымасць дэталізаваць некаторыя абставіны, разглядзіць дакладныя шляхі, якія былі пройдзены дзесяткамі ідэолагаў, арганізатараў і непасрэдных стваральнікаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Па-сутнасці, і сёння не створана дэталёва прапісаная гісторыя тых, каму беларусы абавязаны сваім стогадовым узыходжаннем па прыступках навукі і вышэйшай адукацыі. Гэта значыць, пакуль што не напісаны нейкі энцыклапедычны твор, які б таксама

ўмясціў ў сябе хаця б павярхоўныя біяграфічныя нарысы аб многіх дзесятках прафесараў, дацэнтаў, выкладчыкаў, асістэнтаў, лабарантаў, празектараў і іншых універсітэцкіх асоб, якія ва ўмовах рэвалюцыйнага гвалту і скасавання размеранага асабістага жыцця з 1921 г. пачалі сваю творчую працу ў БДУ. Між тым існуе некаторая літаратура, якая абагуліла жыццяпіс найбольш выбітных універсітэцкіх інтэлектуалаў. Нават тая, якую напісалі не аўтары з БДУ і без непасрэднай ініцыятывы з боку яго кіраўніцтва. Напрыклад, даволі грунтоўныя, прасапаграфічна арыентаваныя выданні былой АН БССР і сучаснай НАН Беларусі [5; 7; 8; 3]. І не дзіўна, бо правесці размежаванне паміж універсітэцкімі і акадэмічнымі вучонымі не тое што цяжка, а не мае патрэбы. Гэтыя выдатныя інстытуцыі ствараліся і дзейнічалі, працягваюць дзейнічаць у неразрыўным яднанні. Надзею на пазітыўны працяг зробленага дае план выданняў, які распрацоўваецца да 100-годдзя БДУ. Асабліва ў ім падаецца знакавым шматтомнік «Интеллектуальная элита Беларуси», першая кніга якога ўжо пабачыла свет [6].

Звяртаючыся дакладна да тэмы распавядання, патрэбна адзначыць, што існуе хоць і спрошчаны, але дастакова прадуктыўны шлях узнаўлення важнейшых абставін біяграфій першага пакалення ўніверсітэцкіх выкладчыкаў і некаторых адметных студэнтаў. Гэта наяўнасць у беларускіх і расійскіх архівах велізарнай колькасці асабістых спраў, у якіх зафіксаваны і агульныя звесткі, і дэталі аб лёсе гэтых тысяч людзей. Асабліва насычаны падобнымі «справамі» 205 фонд Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, а менавіта многія іх тысячы, якія ўтрымліваюць у гэтым фондзе вопісы 3, 4, 10 і інш. Амаль кожная справа мае такія выдатныя па сваёй інфармацыйнай насычанасці дакументы, як curriculum vitae і службовыя анкеты рознага кшталту, што па тагачаснай бюракратычнай практыцы не аднойчы павінны былі запаўняць прынятыя на працу ў БДУ. У гэтых дакументах абавязковым складнікам усіх астатніх звестак былі дадзеныя аб тым, чым займаўся грамадзянін ужо ССРБ у рэвалюцыйны 1917 год. Амаль што раз адказы на дадзенае пытанне дапаўняліся ўдакладненнямі аб адносінах да палітычнай сітуацыі, удзелу ў палітычных партыях, у ваенных падзеях і інш.

Такім чынам, толькі зыходзячы з дадзеных гэтых як бы фармальных дакументаў, можна дастаткова аб'ектыўна прасачыць абставіны і характар таго пераходу, які быў зроблены чалавекам ад імператарскай Расіі да савецкай Беларусі. А кожны пражыў свой унікальны лёс за адзін толькі год, калі было патрэбна намацаць аснову будучага жыцця ў такіх хісткіх рэаліях 1917 г. Калі нават не двойчы (сакавік і кастрычнік), а некалькі больш разоў маглі процілегла змяняцца арыентыры ў бачанні заўтрашняга дня. Змяніцца, бо па-рэвалюцыйнаму радыкальна змянялася грамадска-палітычная сітуацыя, ішло перацягванне людзей на свой бок living рознымі палітычнымі сіламі, раслі разбуральныя тэндэнцыі, мацнела нацыянальная самасвядомасць народаў, працягвалася сусветная вайна, набірала размах галеча. Пералік гэтых радыкальных уздзеянняў, што абрынуліся на чалавека 1917 года, можна прадоўжыць. І ва ўсіх падобных найскладаных абставінах творчы чалавек, навуковец, педагог павінен быў знайсці адзіны адказ на пытанне — «Як жыць далей?». А можа, больш спрошчана — «Як выжыць?».

Некаторыя адказы і ёсць магчымасць знайсці ў згаданых вышэй архіўных дакументах. Для больш грунтоўных высноў існуюць многія іншыя даследчыя

крокі, маюцца іншыя крыніцы. У дадзеным выпадку будзем спасылацца амаль што выключна на матэрыялы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Расійскага дзяржаўнага архіва сацыяльна палітычнай гісторыі, Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі, Смаленскага абласнога архіва. І зробім для сябе абмежаванне: прадставім лёс толькі трох — ці абсалютна вядомых, ці не зусім вядомых інтэлекталаў БДУ «першага прызыву». Тых, хто з кастрычніка 1921 г. стаў за кафедры, а таксама хто далей, потым працягнуў распачатую справу перашапраходцаў.

Зразумела, выключным па сваёй ролі, сваёй эрудыцыі і «уключанасці» у рэвалюцыйныя перабудовы для нас усіх назаўсёды застанецца Уладзімір Іванавіч Пічэта — першы рэктар, сапраўдны стваральнік важнейшых інтэлектуальных інстытуцый і накірункаў не толькі ў БДУ, але і ва ўсёй Беларусі. Яго асабістая справа ў НАРБ [10] дастаткова аб’ёмная і ўтрымлівае зашмат каштоўных звестак. У тым ліку і дадзеныя аб занятках пад час двух рэвалюцый 1917 г. Так, у адным з дакументаў удакладняецца факт узнаўлення працы У. І. Пічэты ў Маскоўскім універсітэце якраз у рэвалюцыйным годзе — тады, калі гэты галоўны ўніверсітэт Расіі страціў свой імперскі статус [10, арк. 10]. Таму навукоўцу, мабыць, было прыемна зноў прыйсці ў alma mater, якую ён быў вымушаны пакінуць у 1911 г. з-за нязгоды з палітыкай царскага ўраду ў сферы адукацыі (у асобе міністра народнай асветы Льва Кассо): ад абмежаванняў універсітэцкай аўтаноміі да забароны адкрыцця ўніверсітэтаў, у тым ліку ў Мінску ды Вільні [4, с. 507]. Да Маскоўскага ўніверсітэта Уладзімір Іванавіч прыхіліўся не толькі, каб праз выкладанне зарабляць грошы на пражыццё, але каб завершыць сваю шматгадовую навуковую працу па даследаванню праблем гісторыі Вялікага Княства Літотоўскага. Праз некалькі гадоў у рэкамендацыі на прызначэнне У. І. Пічэты прафесарам па кафедры гісторыі БДУ, якую даў адзін з стваральнікаў сістэмы савецкай вышэйшай адукацыі прафесар В. П. Волгін, было адзначана, што суіскальнік за 1917 год скончыў падрыхтоўку да абароны магістарскай і доктарскай дысертацый па тэме «Аграрная рэформа Сігізмунда-Аўгуста».

Скончыў, нягледзячы на ўсе грамадскія перытрусы і асабістыя пабытовыя праблемы. Каб у хуткім часе, адну за другой 18 лютага і 19 сакавіка наступнага году іх паспяхова абараніць. А таму натуральна, як адзначалася ў рэкамендацыі, «...главный основной интерес его научной работы связан с историей Литовско-русского государства» [10, арк. 2]. Вызывае павагу тое, што Уладзіміру Іванавічу ўдалося менавіта ў 1917 г. выдаць у Петраградзе і Маскве дзве грунтоўныя навуковыя працы «пад дысертацыі»: «Аграрная реформа и литовско-русская шляхта» (у зборніку артыкулаў у гонар М. К. Любаўскага) і «Аграрная реформа Сигизмунда-Августа в Литовско-Русском государстве» (гэта была першая частка, а другая пабачыла свет у 1918 г.) [10, арк. 14].

Але не толькі дысертацыйнай праблематыкай у гэты складаны час займаўся ўсебаковы даследчык. У 1917 г. да друку ў маскоўскіх выданнях будуць падрыхтаваны працы па славістыцы яўна з ухілам на разгляд той праблематыкі, якая была сугучна бягучым расійскім падзеям («Борьба болгар за объединение», «Исторические судьбы сербского народа», «Первые русские социалисты» і інш.). Тым больш у коле навуковых інтарэсаў Уладзіміра Іванавіча актуалізавалася праблематыка, звязаная з ходам падзей на яго роднай украінскай зямлі. Таму натуральна, што ва ўкраінскіх выданнях з’явіліся

два артыкулы, аб якіх потым, ужо ў час працы ў БДУ, У. І. Пічэта будзе згадваць у сваіх справаздачах, але некалькі змягчаючы сэнс іх назваў. Так, калі ў справаздачах адзін з артыкулаў пададзены як «Украинский вопрос в русской исторической литературе» [10, арк. 15], то на сам рэч ён меў назву «Прилучение України до Москви в Московській історичній літературі» і быў надрукаваны ў № 5—6 кіеўскага часопіса «Шлях». А другі артыкул таксама з характэрнай назвай — «Украина и московское самодержавие» — пабачыў свет у тым жа 1917 г. у № 3—6 часопіса «Украинская жизнь».

Патрэбна дадаць немалаважны факт з біяграфіі нашага першага рэктара: ён на працягу такога доўгачасовага ліхалецця, якое распачалося ў рэвалюцыйны 1905 год, працягнулася гадамі сусветнай вайны і дасягнула апагею ў 1917-м годзе, напружана выкладаў самыя розныя гістарычныя дысцыпліны ў Сімферопалі, Ітлузе, Бранску, Самары, Варонежы і, зразумела, у Маскве. І зноў жа — 1918 год адзначыў не толькі абаронай дысертацый, але і ўдзелам у выкладанні асноў беларускай гісторыі для слухачоў Беларускага народнага ўніверсітэта, які быў арганізаваны беларусамі ў Маскве. Ужо ў часы рэктарства ім будзе падрыхтаваная да друку ў славары Граната артыкул пад як бы ў некаторай ступені падсумоўваючай падзеі таго часу назвай — «Белоруссия 1910—1922» [10, арк. 23].

У пэўным сэнсе абагульняючай характарыстыкай У. І. Пічэты часоў рэвалюцыйных можна лічыць словы, выказаныя яго калегам прафесарам М. М. Нікольскім у дакладзе «Очерк жизни и деятельности профессора В. И. Пичеты». Гэты даклад (сярод двух іншых — дацэнта В. Д. Дружчыца і прафесара Д. А. Жарынава) быў зроблены пад час ушанавання 25-годдзя навуковай і педагагічнай дзейнасці рэктара БДУ. Мікалай Міхайлавіч сказаў: «Владимир Иванович не только ученый, он и гражданин, который живо реагирует на все государственные происшествия. Революция не запугала юбиляра: он быстро убедился в живительных соках революции и связал свою судьбу с рабоче-крестьянскими массами Беларуси. Несмотря на то, что не окончилось государственное оформление БССР, Пичета смело становится во главе БГУ и проявляет тут необычные таланты организатора и администратора...» [10, арк. 38]. А асобныя дэталі з грамадска-палітычнага крэда Уладзіра Іванавіча падкрэслі расіязнаўца Д. А. Жарынаў («... с давних времен Пичета глядел на Россию как на федерацию...») і наркам асветы БССР А. В. Баліцкі («При тяжелых обстоятельствах начали строить Белорусский Университет. Это было время необычной бедности и нищеты. Несмотря на это Владимир Иванович стал во главе Университета и, не жалея сил, работал над его организацией» [10, арк. 37].

Нарэшце, свой погляд на сутнасць і ролю рэвалюцый 1917 г. сам У. І. Пічэта выказаў у незвычайнай споведзі, якую ў роспачы напісаў, знаходзячыся ў зняволенні — у ленінградскай турме «Кресты». Гэта ягонае «Мое общественно-политическое кредо», якое аўтару ўдалося колькі гадоў назад надрукаваць [2; 13]. Знясілены і да глыбіні душы пакрыўджаны арыштант пісаў: «Я все время ждал революции, которая пришла вместе с войной... Я с нетерпением ждал прихода революции, которая должна была нанести окончательный удар по старым порядкам. Я, конечно, думал о буржуазно-демократической революции. Революция пришла, она меня захватила... Когда пришла Октябрьская революция, я пошел навстречу ей, хотя я не понимал еще всего того громадного социально-экономического и политического значения,

которое будет иметь Октябрьская революция. Я не испугался революции, я ни на одну минуту не остановил своей работы в школе» [2, арк. 260, 260зв.].

Можно толькі дадаць, што ў Расійскім дзяржаўным архіве сацыяльна-палітычнай гісторыі маецца злёгку скарэктаванае гэтае «крэда». Так, быццам У. І. Пічэта пасля слоў, што рэвалюцыя яго захапіла, дадаў ці ўдакладніў: «...но я не пошел ни с одной политической партией» [11, арк. 21]. Але на матэрыяле з архіва УФСБ прастаўлена паметка «подлинник», тады як на другім — «копия». Таму дадатак наконт адносін гісторыка ў 1917 г. да той ці іншай партыі можна лічыць ці то аўтарскай рэдакцыяй і спробай указаць на сваё недачыненне да няўстойлівага палітычнага становішча 1917 года, ці то падкрэсліць факт сваёй практычнай дзейнасці як беспартыйнага рэктара на карысць справы бальшавікоў у галіне адукацыі і навукі.

Тут хацелася б паразважаць наконт аб'ектыўных прычын актыўнага прыхілення многіх расійскіх інтэлектуалаў да ніспраяргальных наступстваў рэвалюцый 1917 г. Але зробім гэта ў другім фармаце. У выпадку ж з У. І. Пічэтай можна толькі прыняць да ўвагі дастаткова вядомую ацэнку гэтага фенамену, якая належыць выдатнаму рускаму філосафу С. Л. Франку. Ён ужо ў эміграцыі адзначыў: «В ту эпоху преобладающее большинство русских людей из состава так называемой интеллигенции жило одной верой, имело один смысл жизни: эту веру лучше всего определить как веру в революцию... Главное, основная точка устремления лежала не в будущем и его творчестве, а в отрицании прошлого и настоящего...» [12, с. 479]. Між тым мы ніякім чынам не можам спрошчваць сутнасць таго факту, што шматлікія выдатныя навукоўцы на пачатку 1920-х гг. літаральна «знайшлі сябе» менавіта ў Беларусі і рабілі магчымае і нават немагчымае, каб разам з працягам свайго творчага развіцця максімальна садзейнічаць стварэнню амаль што раней невядомых інтэлектуальных сфер. А не толькі кіравацца па жыцці «отрицанием прошлого и настоящего...».

Калі ў працяг тэмы спаслацца на лёс зусім іншага па паходжанню і творчым патэнцыяле аднаго з паслядоўнікаў У. І. Пічэты на пасадзе ўніверсітэцкага рэктара — Аляксея Сцяпанавіча Кучынскага, — то можна прасачыць шлях «у рэвалюцыю» карэннага беларуса «з глыбінкі». І калі для Пічэты 1917 год стаў пераломным як ужо для адбыўшагася ў прафесіі навукоўца і педагога, то для Кучынскага рэвалюцыйны год літаральна азначаў новы якасны этап, радыкальны паварот у біяграфіі.

Аўтару ўдалося ўзнавіць галоўныя этапы жыцця гэтага па-свойму неардынарнага чалавека [14]. Выхаванец Віцебскага настаўніцкага інстытута ў званні радавога, а потым яфрэйтара да лютага 1917 г., як і многія землякі з Беларусі, ваяваў на Румынскім фронце. І ўспрыняў пафас рэвалюцыйных настрояў, што пранiклі ў войска. Больш за тое, ён праявіў актыўнасць і быў пасланы аднапалчанамі ў Петраградскі савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў «для наладжвання сувязяў». У сталіцы былой ужо імперыі Аляксей Сцяпанавіч стаў удзельнікам I Усерасійскага з'езда сялянскіх дэпутатаў з правам дарадчага голасу [1, арк. 10]. Гэта былі бурлівыя дні траўня 1917 г. Вяртанне на фронт у чэрвені 1917 г. было азнаменавана ўступленнем у шэрагі бальшавіцкай партыі. Кастрычніцкую рэвалюцыю вітаў увесь 7-ы інжынерны полк, у якім служыў беларус-яфрэйтар. Салдаты абралі сабе новых камандзіраў, потым полк уключыўся ў палітычнае жыццё, якое было так цяжка зразумець ва Украіне.

Але ў рэшце рэшт салдацкі актыў і ў тым ліку Кучынскі прынялі рашэнне перадыслакавацца з Румынскага фронту ў распараджэнне Заходняга. Так Аляксей Сцяпанавіч вярнуўся на радзіму і ў хуткім часе быў дэмабілізаваны. У снежні 1917 г. ён прыехаў да бацькоў, якія жылі на Мсціслаўшчыне. І распачалася яго вельмі крэатыўная службовая, а праз гады і творчая кар’ера, якая спачатку прывяла ў Мінск, літаральна вынесла на пасаду рэктара БДУ, а потым у кастрычніку 1937 г. нізвергла ў бездань.

Можна прывесці і некаторыя абставіны з не меньш насычаных падзеямі лёсаў зусім іншых па свайму службоваму статусу ў БДУ яго стваральнікаў і будаўнікоў інтэлектуальнага асяроддзя. Напрыклад, хто сёння памятае пра выдатнага гісторыка Іллю Веніямінавіча Герчыкава? Мала хто, хаця ён адзначыўся ва ўніверсітэтах Беларускім і Саратаўскім сваёй плённай працай. Каб потым аказацца па-за гістарыяграфічных аглядаў, па-за інтарэсамі спецыялістаў усеагульнай гісторыі. Гэты чалавек прайшоў выдатную школу станаўлення сваіх прафесійных якасцяў, некалькі гадоў выкладаў курсы Новай і Навейшай гісторыі студэнтам педфака БДУ, потым быў прарэктарам і загадчыкам кафедры ўсеагульнай гісторыі Саратаўскага дзяржуніверсітэта.

Узыходжанне на гэтыя відавочна высокія прыступкі кар’еры гісторыка пачаліся зноў жа ў 1917 годзе. Ураджэнец Рэчыцы да моманту свайго прыходу ў БДУ меў багаты асабісты жыццёвы вопыт і вопыт удзелу ў палітычным жыцці Расіі. Ён прайшоў з 1914 г. франты Першай сусветнай вайны. І як Кучынскі і тысячы салдат, стомленых гэтай вайной, быў захоплены рэвалюцыйнымі плынямі. У сакавіку 1917 г. І. В. Герчыкава аднапалчане дэлегіравалі для ўдзелу ў арганізацыі Маскоўскага савета салдацкіх дэпутатаў. Больш за тое, ён стаў яго першым старшынёй. Потым у чэрвені 1917 г. прыняў удзел у І-м Усерасійскім з’ездзе Саветаў. Натуральным працягам такой палітычнай актыўнасці стала членства ў «Особом совещании для изготовления проекта положения о выборах в Учредительное собрание» і шмат чаго іншага [9, арк. 15—19]. З усіх палітычных партый гэты вайсковец прыхіліўся да праграмы бальшавікоў і ўступіў у РСДРП(б). На гэтым як бы і скончылася ўзыходжанне па палітычнай лесвіцы, бо Ілля Веніямінавіч вырашыў «пайсці ў навуку». Між тым багаж 1917 года зрабіў добры стартавы задзел: без адпаведнай адукацыі Герчыкаў пачаў выкладаць на рабфаку БДУ, быў уведзены ў склад Праўлення ўніверсітэта, без праблем амаль што экстэрнам скончыў педфак, стаў яго дацэнтам і праслыў дастаткова актыўным навукоўцам — спецыялістам па гісторыі рэвалюцыйнага руху ў Германіі. А потым быў Саратаў, кіраўнічыя пасады і працяг навуковай актыўнасці. Вось толькі 1931 год стаў годам апошняга ўзгадвання гісторыка ў анналах нашай памяці і ведаў пра яго... І неабходна прадоўжыць пошукі, каб цалкам узнавіць асабісты лёс гэтага неардынарнага чалавека і навукоўца.

Заяўленая тэма аб уздзеянні рэвалюцыі 1917 г. на фарміраванне новых прафесійных якасцяў першых выкладчыкаў вышэйшай школы Беларусі можна працягваць і ў выглядзе агляду, і праз напісанне грунтоўнай манаграфіі. На самой справе: тэма дае выдатныя магчымасці дакладнага прачытання неверагодных уздымаў і падзенняў, што адбываліся ў лёсах тых інтэлектуалаў, якія ў рэшце рэшт сталі нашымі «першапраходцамі» на складаным шляху пастаноўкі ўніверсітэцкай адукацыі і дасканалых навуковых даследаванняў. Вось толькі як знайсці адназначны адказ на пытанне — «А чаго гэта каштавала

кожнаму з іх?». Такое пытанне заўсёды паўстане перад даследчыкам, які працуе ў кірунку «біяграфікі» ды «прасапаграфіі». І шмат чаго залежыць ад магчымасці пранікнуць як у абставіны часу, так і зразумець логіку, якой кіраваліся вельмі розныя паміж сабой людзі. Розныя, але паяднаныя як раз часам, прафесійнымі якасцямі, адказнасцю за справу, творчым патэнцыялам.

### Бібліяграфічны спіс


1. Архіў Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь. Спр. 90331/15. Архіўна-уліковы № 10604.
2. Архіў УФСБ РФ па Санкт-Пецярбургу і Ленінградскай вобласці. Архіўна-крымінальная справа № П-65245. Т. 9.
3. Ахремчик Р. Президенты НАН Беларуси: история Академии наук в лицах // Наука и инновации. Научно-практический журнал. 2014. № 2 (132). — С. 4—8.
4. Большая Советская Энциклопедия. Т. 11. Третье издание. — М.: Изд-во «Советская энциклопедия», 1973. — 607 с.
5. Выдающиеся люди Белорусской земли (био-библиографический словарь). Ч. I — «Адамов Владимир Владимирович — Куторга Степан Семенович». Машинописная рукопись / Под ред. Т. С. Горбунова и Н. М. Никольского. — 384 с. // З асабістага архіва аўтара.
6. Интеллектуальная элита Беларуси. Основоположники белорусской науки и высшего образования (1919—1941) / С. В. Абламейко [и др.]; под общ. ред. С. В. Абламейко, науч. ред. О. А. Яновский. — Минск: БГУ, 2017. — 303 с.
7. Национальная академия наук Беларуси: историко-документальная летопись, 1928—2008 / сост. Г. В. Корзенко [и др.]; редкол.: М. В. Мясникович [и др.]. — Минск: Беларуская навука, 2008. — 604 с.
8. Национальная академия наук Беларуси: персональный состав, 1928—2015 / сост.: Т. С. Буденкова [и др.]; редсов.: В. Г. Гусаков (пред) [и др.]. — Минск: Беларуская навука, 2015. — 557 с.
9. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей — НАРБ). Ф. 205. Воп. 3. Спр. 1696.
10. НАРБ. Ф. 205. Воп. 3. Спр. 6335.
11. Расійскі дзяржаўны архіў сацыяльна-палітычнай гісторыі. Ф. 147. Воп. 2. Спр. 11.
12. Цыт. па: История человечества. Том VIII. Россия / под общ. ред. А. Н. Сахарова. — М.: ООО «Изд. Дом МАГИСТР-ПРЕСС», 2003. — 756 с.
13. Яновский О. А. «Революция пришла, она меня захватила...». Два текста, объединенные одной судьбой // Беларуская думка. 2011. № 10. — С. 54—64.
14. Яноўскі А. Расстраляны лёс рэктара БДУ Аляксея Кучынскага // Беларускі гістарычны часопіс. 2017. № 10. — С. 4—14.